
«Вясна» — экстрэмісцкае фармаванне.
Што трэба ведаць?

Падтрымай "Вясну" на PATREON

Прысуд за абразу супрацоўнікаў міліцыі - на гэты раз у Бабруйску

26.05.2021 **Тэгі**: суды, крымінальны пераслед



Ірына Барздова. Фота: Белсат.

У судзе Бабруйскага раёна і Бабруйска 26 траўня вынесены прысуд Ірыне Барздовай, якую абвінавацілі ў абразе супрацоўнікаў міліцыі (арт. 369 Крымінальнага кодэксу).

Справу разглядаў суддзя **Васіль Галкоўскі.**

Пацярпелыя – намеснік начальніка аддзела міліцыі Ленінскага раёна Бабруйска, начальнік міліцыі грамадскай бяспекі **Андрэй Сябецкі** і начальнік аддзела аховы правапарадку і прафілактыкі УУС Бабруйскага гарвыканкама **Сяргей Рудзько**.

Па матэрыялах следства, Барздова ў кастрычніку мінулага года ў адным з тэлеграм-каналаў эмацыйна выказалася пад запісам пра двух знаёмых міліцыянтаў. Праз некалькі дзён да жанчыны прыйшлі з ператрусам і паведамілі, што супраць яе распачалі крымінальную справу.



Дзве тысячы рублёў за каментар у Telegram патрабуюць міліцыянты ад маці ў дэкрэце

Абодвух міліцыянтаў яна ведала раней са станоўчага боку, а тут убачыла, што пра іх паўсюль пішуць у негатыўным ключы, праз што расчаравалася ў іх, была закранутая і не змагла прайсці міма.

У судзе Ірына Барздова пацвердзіла, што напісала той каментар, але зазначыла, што не лічыць яго абразлівым. Жанчына патлумачыла, што не мела на мэце некага прынізіць, а выказалася эмацыйна.

Сёння суддзя Галкоўскі вынес прысуд: Барздову прызнаць вінаватай і прызначыць пакаранне ў выглядзе а**бмежавання волі тэрмінам на адзін год без накіравання ва ўстанову адкрытага тыпу.**

Апроч гэтага абвінавачаная павінна аплаціць кампенсацыю маральнай шкоды Сябецкаму і Рудзько па 700 рублёў кожнаму.

Опубликовать



СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ

У Мінску да "хатняй хіміі" за ўдзел у акцыях пратэсту асудзілі эканамістку і бухгалтарку

Насупраць ГУБАЗіКа, каля Акадэміі навук і гандлёвых цэнтраў. У Мінску з затрымкай вызначылі забароненыя месцы для перадвыбарчых пікетаў

Мінчука асудзілі за ўдзел у адной акцыі пратэсту. У якасці доказа выкарысталі яго "аператыўнае апытанне"

На цэнтральных плошчах і каля рэдакцый. Дзе на Міншчыне забаронена збіраць подпісы па вылучэнні кандыдатаў

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА


Беларусы на "крытай": як палітвязняў працягваюць пераследаваць у калоніях

(дапоўнена)


Жанчыны ў палітзняволенні: хто яны і за што сядзяць

Недахоп паветра, перапоўненая камера, ноч са святлом. Пра што беларусы распавядалі падчас дакументавання ў 2023 годзе

"Незразумела, чаму ў 21 стагоддзі хтосьці мусіць спаць на дошках у выглядзе пакарання", — былы палітвязень ПК-15







АПОШНІЯ НАВІНЫ

Аддана служыць праваабарончым ідэалам: дзейнасць "Вясны" ў новых умовах

Былога вайскоўца Паўла Кучынскага асудзілі да 19 гадоў зняволення

Заява аб прызнанні 14 чалавек палітычнымі зняволенымі

Беларусы на "крытай": як палітвязняў працягваюць пераследаваць у калоніях (дапоўнена)

Аблава на раварыстаў, абнаўленне спіса "экстрэмістаў": хроніка пераследу 28-29 снежня

Жанчыны ў палітзняволенні: хто яны і за што сядзяць

На Піншчыне падлеткаў прывучаюць да ўдзелу ў выбарах

Уладзімір Каранік наведаў Гродзенскі медуніверсітэт, дзе разважаў пра “змяняльнасць” улады


МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ


Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Лістапад 2023

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Выбары*2024







ПАРТНЁРСТВА

РАДЫЯ

kamunikat
Беларуская Інтэрнэт-Бібліятэка

ВЫТОКІ

ADC memorial
Anti-Discrimination Centre

Московская Хельсинкская группа

AMNESTY INTERNATIONAL

МІЖНАРОДНЫ КАМІТЭТ ПА РАССЛЕДАВАННІ КАТАВАННЯЎ У БЕЛАРУСІ

СЯБРОЎСТВА

EENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

Беларуская асацыяцыя журналістаў
baj.by

VOICE OF BELARUS

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY